**Бондарава, Т.** Па законах прыгажосці / Т. Бондарава // Настаўніцкая газета. – 2024. – 13 лют. – С. 6.

**Па законах прыгажосці**

**Народны тэатр моды «Стыль» Віцебскага дзяржаўнага індустрыяльна-тэхналагічнага каледжа – візітная картка вобласці.**



Больш за паўстагоддзя працуе ва ўстанове адукацыі ўнікальны калектыў, які з 2002 года носіць званне народнага. Прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 19, дзе ён пачынаў дзейнасць, было арыентавана на бытавое абслугоўванне насельніцтва. Навучэнцы не толькі вучыліся шыць па індывідуальным заказе, але і дэманстравалі свае вырабы: гэта прадугледжвала вучэбная праграма. Акрамя непасрэднай работы з заказчыкамі, у пэўны момант было вырашана асобна адшыць некалькі тэматычных калекцый адзення. Увасобіць ідэю ў жыццё ўзялася мадэльер-канструктар Людміла Ціханава – яна і зараз стаіць ля вытокаў стварэння кожнай калекцыі. А для публічнага паказу мадэлей арганізавалі стацыянарны тэатр моды.

Сёння можна з упэўненасцю сказаць, што кожны прэм’ерны выхад «Стылю» на подыум становіцца значнай і рэзананснай падзеяй. Прысвечаная гістарычнаму касцюму гараджан «Пінская шляхта» і «Вітражы» па матывах шагалаўскіх работ, «Геральдычныя малюнкі Віцебскай вобласці», дзе адлюстраваны гербы і адметнасці 24 раёнаў і гарадоў, «Мая Радзіма Беларусь», якая сімвалічна перадае прыгажосць і асаблівасці ўсіх рэгіёнаў любімай краіны…

*У штодзённым жыцці такія сукенкі не апранеш. Затое яны, у адрозненне ад зменлівых модных лукаў, заўсёды будуць у трэндзе. Як і любоў да Радзімы, адвечныя чалавечыя каштоўнасці, нацыянальныя традыцыі.*

Фактычна мадэлі адзення ўяўляюць сабой мастацкія творы і адначасова наглядныя дапаможнікі па аўтарскіх метадычных распрацоўках. Што, у сваю чаргу, з’яўляецца вынікам грунтоўнай калектыўнай даследчай работы. Задзейнічаны ў ёй як выкладчыкі, майстры вытворчага навучання, так і навучэнцы каледжа. Дарэчы, ідэі некаторых калекцый належаць яго дырэктару Ірыне Кісялёвай.

Строгай перыядычнасці для выпуску не існуе: як правіла, прэм’еры прысвячаюцца пэўнай значнай падзеі, памятнай даце. Народны тэатр моды «Стыль» пад кіраўніцтвам педагогаў Настассі Гайдуковай і Таццяны Івановай – пераможца шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. Яго выступленні актыўна выкарыстоўваюцца ў выхаваўчай і прафарыентацыйнай рабоце, часта ўпрыгожваюць афіцыйныя мерапрыемствы высокага ўзроўню – калектыў па праве можна назваць візітнай карткай Віцебшчыны.

– У нас займаюцца навучэнцы ва ўзросце 15–18 гадоў, пераважна дзяўчаты, – расказала Настасся Гайдукова. – Нярэдка здараецца, што сукенку на подыуме прадстаўляюць тыя, хто раней прыклаў рукі да вырабу, – і вельмі гэтым ганарацца. А ўвогуле, дзверы тэатра моды адчынены як для будучых мадэльераў-канструктараў, тэхнікаў-тэхнолагаў, швачак, так і для іх сяброў па каледжы, хто набывае прафесію лагіста, мерчандайзера, цырульніка, візажыста. Варта дадаць, прычоскі, візаж для выступленняў – зноў жа плён фантазіі і майстэрства нашых навучэнцаў і іх выкладчыкаў, майстроў вытворчага навучання. Зусім нядаўна «Стыль» вярнуўся з паездкі на ВДНГ, дзе ўдзельнічаў у днях Віцебскай вобласці ў рамках Міжнароднай выставы-форуму «Расія».

– Нашы 14 дзяўчат, якія займаюцца ў гэтым аб’яднанні па інтарэсах, зрабілі сапраўдны фурор, па некалькі разоў штодзень выходзілі на біс, – паведаміла намеснік дырэктара па вучэбна-вытворчай рабоце Марына Савіна. – Працавалі дастаткова інтэнсіўна, было па 20 выхадаў у дзень. У вольны час яны бліжэй азнаёміліся з расійскай сталіцай. Тэатр моды прадэманстраваў калекцыі адзення «Святочная», «Новыя аксіёмы», «Няхай будзе так», «Кветкавая фантазія» і «Будучыня праз вякі». Між тым наперадзе – паказ новай калекцыі, рыхтуемся правесці яго літаральна праз некалькі тыдняў.

**Таццяна БОНДАРАВА.**

**Фота прадастаўлена Віцебскім дзяржаўным індустрыяльна-тэхналагічным каледжам.**